# ПАГРОЗЫ РАЗВІЦЦЮ І ПЕРААДОЛЕННЕ КРЫЗІСУ ЧАЛАВЕЧАГА ІСНАВАННЯ

**П. У. Баркоўскі**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*
*E-Mail: barkouski@tut.by*

Немагчыма ўявіць існаванне чалавека па-за межамі трох найбольш істотных складнікаў ягонага жыцця – прасторы прыватнага бытавання, якая залучае ў сябе асабовыя і інтымныя аспекты існавання; сферы публічнай актыўнасці, акумуляцяй якой стаецца грамадска-палітычнае жыццё; і, нарэшце, вымярэння духоўнага жыцця, увасобленага на ўзроўні культуры. Усе гэтыя складнікі прадвызначаюць не толькі фармаванне і практычнае дастасаванне чалавечага светапогляду, але і спрычыняюць магчымае развіццё асобнага чалавека і суцэльных грамадстваў. Іхная супярэчлівасць альбо відочная стагнацыя спрычыняюць масштабныя крызісы духоўна-маральнага кшталту і могуць зусім негатыўна адбіцца на будучым развіцці чалавецтва.

Але тое, што мы ў стане назіраць сёння, трапна ўпісваецца ў акрэсленую вышэй схему светапогляднага крызісу, што спрычыняе пэўнае “сплашчэнне” свету. Прыватнае існаванне нельга адмыслова адрываць ад публічнага, як пра тое справядліва заўважае нямецкая даследніца Г. Арэнд [1], хаця б дзеля таго дзеля, што прынцыпы, на якіх мы грунтуем вымярэнне ўласнага асабістага існавання – рэлігійна-маральныя каштоўнасці, культурніцкія нормы і правілы, – існуюць пераважна ў вымярэнні публічнага, адкуль мы іх і пераймаем на ўласны густ. Аднак найгалоўны прынцып, які зараз пануе над гэтымі дзвюма сферамі – гэта прынцып радыкальнага плюралізму і рэлятывізму, які нямецкі філосаф М. Хайдэгер акрэсліў праз вызначэнне “еўрапейскі нігілізм” [2]. То, што мы сёння прызвычаіліся аналізаваць пад назвамі постмадэрнага мыслення, культуры або спосабаў існавання, паўстае на тле разбурэння традыцыйных сістэмаў каштоўнасцяў. І перадусім найгалоўнай з іх – каштоўнасці Бога, канец якой яшчэ напрыканцы XIX ст. спавясціў Фрыдрых Ніцшэ [3]. Разбурэнне іерархіі каштоўнасных парадкаў вядзе да фармавання светапогляду, які надзвычай талерантны да любых каштоўнасцяў і не схільны бачыць нават супярэчнасці між імі. Рэлятывізацыя сістэмы каштоўнасцяў спрычыняе духоўную непераборлівасць і нежаданне абіраць свядома ўласную норму існавання – гэта стаецца справай выпадку, дыялогу напластаваных культур і традыцыяў, панаваннем эстэтычнага канону (пад дэвізам: “гэта мне больш падабаецца” заміж “я лічу гэта вартым”). Падобная непераборлівасць і рэлятывізм прыватнага розуму і грамадскай думкі спрычыняе сапраўдны нігілізм – адмаўленне ад веры ў пазітыўныя каштоўнасці і гадаванне нішчымнасці – нас больш нічога напраўду не цікавіць, мы верым у нішто, працуем і адпачываем без гранічнага адказу на пытанне, а дзеля чаго? Скуткам падобнага размывання сістэмы светапогляду стаецца “мазаічная свядомасць” сучаснага чалавека, якая не мае пэўнага стрыжня, але выглядае як пярэсты набор розных думак, традыцыяў, нормаў, мараляў і г. д. Гэта выглядае на страту вектару далейшага развіцця і абрынанне ў безліч вобразаў жыцця, што істотна дэфармуе прастору прыватнага існавання чалавека.

Далей, што датычыць сферы грамадска-палітычнага існавання, дзе чалавек знаходзіць сябе разам з іншымі і набывае прагу да канструявання і ўвасаблення базавых каштоўнасцяў – справядлівасці, свабоды, веры і г. д. Яна ў сваю чаргу таксама наскрозь прасякнутая сымптомамі згаданага нігілізму. Калі грамадства цягам некалькіх апошніх стагоддзяў пазбывалася рэлігійнага чынніку свайго развіцця, намагаючыся здзейсніць сябе ў якасьці цалкам сэкулярызаванага, яно перадусім прапанавала падставіць на месца веры паняцце гэтак званай “свецкай веры” – ідэалогіі. Апошняя вызначалася як скардынаваная сістэма каштоўнасцяў, прынцыпаў, нормаў, правіл і механізмаў іх інтэрпрэтацыі, якая павінна была

забяспечыць праект прагрэсіўнага грамадскага развіцця па-за межамі рэлігійнай веры. Гэта спрычыніла тое, што бадай усё XX ст. адбывалася пад знакам эпохі вялікіх ідэалогіяў, альбо, па вызначэнню Ф. Ліятара, “вялікіх наратываў” – камунізму, лібералізму, нацызму і г. д. [4]. Відавочныя заганы паслядоўнага ўвасаблення падобных ідэалогіяў, іх пераважна дэгуманістычная сутнасць і скрайні цынізм у дачыненні да чалавечага існавання спрычынілі адмову ад колішніх спробаў забяспечыць існаванне грамадства і сістэму ягоных каштоўнасцяў на базе абсалютызаваных каштоўнасцяў – справядлівасці, свабоды, еднасці. Адзіная каштоўнасць, якая засталася ў якасьці вызначальнай, магчыма і таму таксама, што яна не схільная спрычыняць грамадскі прагрэс, а кансервуе ягоны існы стан – гэта каштоўнасць дабрабыту, альбо спажывання. Эканамічная логіка развіцця грамадства застаецца на сёння пераважнай тэндэнцыяй, якая вызначае ўсе асноўныя сферы публічнай актыўнасці, улучна і палітычнае жыццё.

Грамадства спажывання зараз функцыянуе, водле вызначэння французскага інтэлектуала Гі Дэбора, як “грамадства спектаклю” [5], паколькі ідэалогія спажывання спараджае спрошчаную мадэль свету, дзе вобразы і выявы ў іхнай сымбалічнай повязі замяняюць рэальныя рэчы і стасункі, што ствaрае глабальны спектакль – кірмаш вобразаў жыцця. Схемы падвышанага спажывання транслююцца на ўсіх узроўнях, яны спрычыняюць светапогляд чалавека, скіраваны на атрыманне здавальнення ад прадуктаў матэр’яльнай і духоўнай культуры як прадметаў раўнаважнага спажывання. У гэткім разе мэты індывідуальнага і грамадскага існавання рэдукаваныя да забеспячэння эфектыўных механізмаў спажывання і залучэння кожнага ў гэты працэс. Пры гэтым рэлятывізм і каштоўнасная індыферэнцыя не ўплывае на стан спажывання радыкальным чынам, бо мадэль сусветнага гіпермаркету мае на ўвазе магчымасць суіснавання зусім розных па якасьці і кошту тавараў, попыт на якія можна стымуляваць шляхам разгорнутых рэкламных кампаніяў, што спараджаюць існыя і ўяўныя патрэбы ў чалавека. Зрэшты падобны прынцып грамадскага і прыватнага існавання таксама спараджае крызу светапогляду, паколькі выбары ў межах мадэлі спажывання пераважна ўяўныя і абумоўленыя звонку, а чалавек праграмуецца на трапны лад спажывання з дапамогай вельмі ўспрымальнай і кіруемай каштоўнаснай сістэмы.

У галіне палітычнага ўздзеянне ідэалогіі спектаклю выяўляецца перадусім у кансервацыі існага грамадска-палітычнага парадку праз ператварэнне прасторы палітычнага як вымярэння свабоды ў абсяг постпалітыкі, які, па вызначэнню расійскага філосафа А. Дугіна [6], можа быць акрэслены праз паняцце дэзанталагізацыі палітыкі – палітычнае пазбаўляецца рэальнасці свайго быцця, замест якога прапануецца ладны палітычны спектакль, дзе словы страчваюць свой першапачатковы сэнс, грамадскі выбар губляе сваю значнасць, пазіцыя асобнага чалавека ператвараецца ў пазіцыю пасіўнага назіральніка, які ніяк не ўплывае на ход падзей і можа адно спажываць навязаныя яму вобразы палітычнага. Верагодна апошняй тэндэнцыяй можна збольшага патлумачыць значны сацыялагічны факт – паступовае знікненне інтарэсу да палітыкі і палітычнай актыўнасці ў бальшыні грамадстваў. Праз навязанне каштоўнаснага рэлятывізму і шматінтэрпрэтатыўнасці паняццяў, якія ўвасабляюць грамадскія ідэалы, палітычнае вымярэнне нашага жыцця паступова пераходзіць у фармат тэлевізійнага шоў, спектакля, які мы спажываем, як і шмат якія іншыя рэчы.

Нарэшце, можна зафіксаваць панаванне агульнай тэндэнцыі да фармавання культуры вобразаў, якая забяспечвае духоўнае вымярэнне грамадству спажывання, або спектакля. Галоўнай ідэалогіяй існавання культуры ў большасці краінаў, у тым ліку верагодна і нашай, стаецца ідэя прадавальнасці і спажывальнасці культурнага прадукту: культура мае забяспечваць культурную патрэбу, а твор культуры – гэта грамадска значны тавар. Асноўнай логікай развіцця культуры ў такім выпадку будзе стварэнне неабмежаванага попыту на культурны прадукт, які не ставіць сабе за мэту нішто іншае, як быць упадабаным будучым спажыўцом, светапоглядная сістэма якога разбураная рэлятывізмам і праз тое лёгка прыдатная для маніпулявання. Задачы, якія ставіць перад культурай грамадства

спажывання – гэта больш не развіццё чалавечай прыроды, ягонай духоўнасці і г. д., але татальная прапанова, што мае забяспечваць канкрэтныя патрэбы на адпачынак – культурная індустрыя [7].

Такім чынам, калі падрахаваць, атрымліваецца, што адной з найбольш пагражальных і магістральных з тэндэнцыяў чалавечага існавання, якую можна дыягназаваць, з’яўляецца рэлятывізацыя каштоўнаснай сістэмы і светапогляду чалавека на ўсіх узроўнях, што спрычыняе ягоны маральны і інтэлектуальны нігілізм, культуру і палітыку спажывання. Яны ў сваю чаргу пагражаюць карэнным чынам знішчыць умовы для далейшага развіцця чалавека і грамадства, бо кансервуюць існы стан разгубленасці і зачараванасці вобразам.

Магчымым пераўзыходжаннем падобнага стану рэчаў можа быць нейкі фундаментальны зрух, які абавязкова павінен закранаць усе азначаныя сферы чалавечага існавання – прыватную, публічную і духоўную, бо спроба пераадоліць склаўшуюся тэндэнцыю толькі ў адной апрычонай галіне верагодна не дасі рады. Перадусім на прыватным узроўні напрамак падобнага пераадолення можа мець на ўвазе вяртанне да трывалай сістэмы каштоўнасцяў і “моцнага” светапогляду – шляхам рэнесансу пераасэнсаваных на новы лад альбо новых маральна-рэлігійных каштоўнасцяў дзеля пераадолення стану нігілізму. Што да грамадска-палітычнага ўзроўню, дык гэта можа мець на ўвазе вяртанне да сапраўднага сэнсу палітычнага дзеяння, узнаўленне палітычнага вымярэння на тле каштоўнасцяў грамадзянскай ініцыятывы. І, нарэшце, правакаваць пераадоленне культуры спажывання праз знаходжанне новых механізмаў духоўнага здавальнення, радасці, неабцяжаранай здабываннем карыснага, гадаванне новай культурнай патрэбы. Адно разам падобныя высілкі могуць спарадзіць плён, што толькі і можа спрычыніць будучае развіццё. І традыцыйныя рэлігійныя і маральныя каштоўнасці зноў могуць тут прыдацца.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. *Арендт, Х. Vita activa, или О деятельной жизни / Пер. с нем. и англ. В. В. Бибихина; Под ред. д. М. Носова. – СПб.: Алетейя, 2000.*
2. *Хайдеггер, М. Европейский нигилизм / М. Хайдеггер. – Хайдеггер М. Время и бытие: Статьи и выступления. М.: Республика, 1993.*
3. *Ницше, Ф. Человеческое, слишком человеческое; Веселая наука; Злая мудрость: афоризмы и изречения / Ф. Ницше. – Минск: Попурри, 1997.*
4. *Лиотар, Ж.-Ф. Состояние постмодерна. / Ж.-Ф. Лиотар. Пер. с франц. Н. А. Шматко. М.: Институт экспериментальной социологии; СПб.: Алетейя, 1998.*
5. *Ги Дебор. Общество спектакля / Ги Дебор. – Пер. с фр. С. Офертаса и М. Якубович. М.: Логос, 2000.*
6. *Дугин, А. Философия политики / А. Дугин. М., Арктогея, 2004.*
7. *Хоркхаймер, М., Адорно, Т. Диалектика Просвещения. Философские фрагменты / Макс Хоркхаймер, Теодор В. Адорно. Перевод с немецкого М. Кузнецова М.-СПб.: Медиум, Ювента, 1997.*